PolotskSU



УДК 391+72.03

# НЯМЕЦКІЯ ФОТАЗДЫМКІ ПЕРШАЙ СУСВЕТНАЙ ВАЙНЫ ЯК КРЫНІЦЫ ПА ВЫВУЧЭННІ МАТЭРЫЯЛЬНАЙ КУЛЬТУРЫ ЗАХОДНЯГА ПАДЗВІННЯ

**Друпаў А.Ю.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск
**Багданаў У.А.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск

*У артыкуле разглядаюцца нямецкія фотаздымкі Першай сусветнай вайны як крыніцы па вывучэнні этнаграфічнай спадчыны захаду Падзвіння. У артыкуле выкарыстоўваюцца фотаздымкі з калекцыі У. Багданава, якія былі зроблены на тэрыторыі сучаснага Пастаўскага раёна Віцебскай вобласці. Аўтары аналізуюць нямецкія фотаздымкі, як крыніцы па этнаграфіі, і прыходзяць да высновы, што нямецкія фотаздымкі Першай сусветнай вайны з'яўляюцца карыснымі крыніцамі для вывучэння матэрыяльнай культуры захаду Падзвіння пачатку XX ст. Найбольш дасканала на падставе фотаздымкаў можна даследаваць народнае дойлідства і народнае адзенне. У артыкуле, грунтуючыся на нямецкіх фотаздымках Першай сусветнай вайны, аўтары характарызуюць народную архітэктуру захаду Падзвіння, разглядаюць планіроўку паселішчаў, забудову двара, архітэктуру хаты. Таксама на падставе фотаздымкаў даецца характарыстыка традыцыйнаму адзенню заходняга Падзвіння, разглядаецца мужчынская, жаночая, дзіцячая вопратка.*
***Ключавыя словы:*** *Першая сусветная вайна, этнаграфія, народная архітэктура, дойлідства, народнае адзенне, строй.*

Лінія фронту Першай сусветнай вайны на тэрыторыі Беларусі стабілізавалася восенню 1915 г. На захадзе Падзвіння яна праходзіла па тэрыторыі сучасных Браслаўскага і Пастаўскага раёнаў наступным чынам: уздоўж ланцуга азёраў ад в. Нарач на поўнач (уздоўж азёр Мядзел, Варанец, Доўжа) да г. Паставы і далей на поўнач (па азёрах, р. Мядзелка, групы азёраў ля м. Відзы) да возера Дрысвяты. Адпаведна, па заходніх берагах рэк і азёр знаходзіліся нямецкія войскі, па ўсходніх – рускія.

На поўначы Беларусі стаяў нямецкі XXI Армейскі корпус, непасрэдна на Пастаўшчыне 31-я і 42-я пяхотныя дывізіі. Фотаздымкі, якія разглядаюцца ў гэтым артыкуле, былі зроблены жаўнерамі гэтых палкоў на тэрыторыі сучаснага Пастаўскага раёна.

Фатаграфаванне была даволі папулярным заняткам сярод нямецкіх жаўнераў на фронце, даволі вялікая частка жаўнераў мела свае асабістыя фотаапараты. Фотаздымкі рабіліся з розных нагодаў: на памяць, у фотаальбом, каб даслаць дадому, для прэсы, для будучых палкавых гісторый – кніг, што масава выдаваліся пасля вайны і апісвалі баявы шлях палка. Праяўляліся і друкаваліся фотаздымкі тут жа, на фронце, у палявых фоталабараторыях. Часта яны друкаваліся на ўжо гатовых бланках фотапаперы, якія з іншага боку былі падзелены на палі для тэксту і адрэсы. Такім чынам жаўнер атрымліваў арыгінальную фотапаштоўку, якую мог даслаць родным у Германію.

У аб'ектыў жаўнера трапляла ўсё яго жыццё: баявыя дзеянні, акопны побыт, фотаздымкі з аднапалчанамі. Некаторых жаўнераў цікавіла у тым ліку і мясцовасць, куды яны трапілі, яе прырода і культура. Так у альбомы жаўнераў трапляюць партрэты мясцовых жыхароў, забудова. Але не заўжды этнаграфічны матэрыял фатаграфаваўся свядома, даволі часта забудова альбо мясцовыя жыхары трапляюць на фотаздымкі выпадкова, без мэты іх фіксацыі. Але нават такія, выпадкова зафіксаваныя кавалкі тагачаснага жыцця, могуць з'яўляцца каштоўнымі крыніцамі па вывучэнні этнаграфіі.

У артыкуле будуць разглядацца фотаздымкі з асабістай калекцыі Уладзіміра Багданава, зробленыя нямецкімі жаўнерамі на тэрыторыі сучаснага Пастаўскага раёна.

Захад Падзвіння – вельмі цікавы рэгіён, у якім прасочваецца ўплыў 3 этнаграфічных рэгіёнаў: уласна Падзвіння, Цэнтральнай Беларусі і Віленшчыны. Пад Віленшчынай нектаорыя даследчыкі народнага тэкстылю вылучаюць паўночна-заходні рэгіён Беларусі, землі якога раней уваходзілі ў склад Віленскай губерніі. Гэты рэгіён адметны, перадусім, сваімі ткацкімі традыцыямі На захадзе Падзвіння распаўсюджаны віленскія шматнітовыя ручнікі, арэял якіх ахоплівае ўсю Віленшчыну [7, с. 866]. Уплыў Цэнтральнай Беларусі прасочваецца на захадзе Падзвіння ў архітэктуры – тут распаўсюджаны як вяночныя двары, так і пагонныя [3, с. 72].

Архітэктурная разнастайнасць добра бачна на фотаздымку вуліцы вёскі Малая Волься (Фота 1). На фотаздымку выразна бачна вулічная планіроўка паселішча. Звяртае на сабе ўвагу разнастайнасць канструкцый стрэх: прысутнічаюць як 2-схільныя, так і паўвальмавыя стрэхі на хатах. Прычым, паўвальмавыя стрэхі 2 відаў: з залобкам і з прычолкам. На фотаздымку вуліцы в. Норкавічы (Фота 2) таксама суседнічаюць 2-схільныя і паўвальмавыя стрэхі. Абодва гэтыя фотаздымкі паказваюць вулічную планіроўку паселішчаў, але іх ракурсы недастаткова шырокія для таго, каб з упэўненасцю сказаць аб тыпах двароў. Хаты стаяць даволі шчыльна адна да адной, таму можна выказаць здагадку, што сярод іх могуць прысутнічаць пагонныя двары, якія былі не ўласцівыя для Падзвіння, што якраз-такі тлумачыцца ўплывам Цэнтральнай Беларусі на захад рэгіёну.

Агулам, пагонныя двары на Беларусі з'яўляюцца пад уплывам "Уставы на валокі" 1557 г., якая ў першую чаргу закранула заходнюю частку Беларусі. На Поўначы Беларусі рэформа была часткова праведзена толькі ў XVIII ст. і больш паўплывала на планіроўку паселішчаў, чым двароў. Вяночныя двары захоўваліся нават там, дзе паселішчы ўжо набылі вулічную планіроўку [1, с. 274].

Даволі цікавы фотаздымак з в. Вярэнькі (Фота 3). Гэтая вёска таксама мае выразную вулічную планіроўку. Тут мы таксама сустракаем 2-схільную і паўвальмавую страху ў адным паселішчы. Але ракурс гэтага здымка ўжо дазваляе нам пабачыць забудову двароў. На левым баку вуліцы знаходзіцца ўласцівы для гэтага рэгіёна вяночны двор. Бліжэйшы да нас двор з правага боку вуліцы мае П-падобную планіроўку, наступны за ім двор ужо ня бачны, бачна толькі асобна стаячая хата. Гаспадарчае звяно закрыта дваром на пярэднім плане. Магчыма, там знаходзіцца двор з безсістэмнай забудовай, які ж з'яўляецца на Беларуіс на пачатку XX ст.

PolotskSU






**Фота 1. – Вёска Малая Волься, 1916 г. Надпіс на фота: "Руская вёска, дзе мы часта жылі. 4 км ад фронта" Здымак з альбому лейтэнанта Рубенса, 17-ы пяхотны полк. Архіў У.Багданава**




**Фота 2. – В. Норкавічы, зіма 1916-1917 гг. Здымак з альбому жаўнера 52-га пяхотнага палка. Архіў У.Багданава**




**Фота 3. – На ўскрайку в. Вярэнькі, 1917 г. Архіў У.Багданава.**

PolotskSU



Апроч класічных вяночных і пагонных двароў сустракаліся на захадзе Падзвіння і больш цікавыя формы двароў. Так, на Падзвінні быў пашыраны крыты двор – двор, у якім агульнай страхой апроч гаспадарчых будынкаў быў накрыты і падворак. Некалькі варыянтаў такога двара былі зафіксаваны і нямецкімі жаўнерамі. Адзін з іх быў замаляваны жаўнерам Г. Фраўдэ ў вёсцы Грэйці (Фота 4). У фотаальбоме жаўнера 131-га пяхотнага палка ёсць фотаздымак такога кшталту двара з в. Норкавічы (Фота 5). Цікава, што ва ўсіх выпадках накрытая страхой частка займае нязначную частку двара. Можна лічыць, што гэта далейшы крок у развіцці крытага двара, калі насупраць дваравога фасаду хаты вылучаўся “чысты двор” (месца на падворку, куды не выходзіла жывёла), а пад агульнай страхой пакідаўся толькі “дзяннік” (прастора падворка, дзе знаходзілася свойская жывёла). Варта адзначыць, што зафіксаваныя ў літаратуры крытыя двары збольшага паходзяць таксама з Пастаўскага раёна (вв. Акелы, Камаі) [1, с. 249-250].




**Фота 4. – Сялянскі двор у в. Грэйці. Малюнак на паштоўцы нямецкай палявой пошты, дасланай 9.12.1916 г. Аўтар малюнку – Г. Фраўдэ (G.Fraude). Архіў У.Багданава.**




**Фота 5. – Сялянская сям’я ля свайго дома ў в. Норкавічы, 1916 г.
Здымак з альбому жаўнера 131-га пяхотнага палка. Архіў У.Багданава**

PolotskSU



Цікавы двор зафіксаваны ў в. Баяры (Фота 6). Нягледзячы на тое, што галоўнай мэтай фотаздымку была фіксацыя рыбакоў, якія рамантуюць сеткі, на ім можна добра разгледзець элементы падворка. Двор хутчэй за ўсё пагоннага тыпу, мае асобна стаячую клець, пастаўленую насупраць вокнаў бакавога фасаду хаты, што тыпова для пагоннай забудовы Захаду Беларусі. Хата ўпрыгожана вертыкальная шалёўкай, мае ганак, што дае паставы меркаваць, што двор належыў заможнаму гаспадару.



**Фота 6. – Рыбакі чыняць сеткі ў в. Баяры ля воз. Вялікія Швакшты, чэрвень 1916 г. Архіў У.Багданава**

На фотаздымку з в. Барадзіно (Фота 7) таксама зафіксаваны пагонны двор. Тут мы выразна бачым выбрукоўку на чыстым двары. Такое афармленне дваравой прасторы сустракалася збольшага на поўначы Беларусі, што звязана, перадусім, з шырокім распаўсюдам каменю ў гэтым рэгіёне. Цікава, што ў сваіх экспедыцыях С.А.Сергачоў таксама зафіксаваў выбрукоўку двара ў Пастаўскім раёне (в. Акелы) [4, с. 91].




**Фота 7. – Дзеці ў в. Барадзіно. Паштоўка нямецкай палявой пошты, адпраўлена жаўнерам 40-га рэзервнага пяхотнага палка 24 траўня 1916 г. Архіў У.Багданава**

PolotskSU



Вельмі цікавы фотаздымак дома ў фальварку Міла (Фота 8), на якім прадстаўлена 3-камерны будынак з планіроўкай хата-сені-хата. Такога кшталту забудова на Беларусі сустракалася збольшага на Падняпроўі і Падзвінні [5, с. 258]. У дадзеным будынку звяртае на сабе ўвагу той факт, што сені маюць 2 уваходы: па адным на кожную жылую хату. Магчыма, знутры сені таксама былі падзелены перагародкай з дошак. Абедзве хаты маюць коміны, увесь будынак накрыты вальмавай страхой. На фотаздымку выразна бачна, што правая частка будынку мае буйнейшыя вокны, а таксама навейшую страху. Магчыма, гаспадары такім чынам пашырылі сваю старую хату, якая мела 2-камерную планіроўку (хата-сені), дабудаваўшы яшчэ адну хату да сенцаў. Таксама такая планіроўка магла ўтварыцца, калі ў хаце жылі 2 пакаленні сям'і, напрыклад, сям'я бацькоў і сям'я дарослага сына.




**Фота 8. – Дом у фальварку Міла ля в. Баяры, 1916–1917 гг. Архіў У.Багданава**

Калі больш дэтальна разглядаць архітэктуру хат, то на падставе нямецкіх фотаздымкаў можна сцвярджаць, што на Пастаўшчыне хаты будаваліся з кругляка, вуглом у астатак. Тарцы бярвенняў звычайна не апрацоўваліся, зрэдку кантаваліся на брус ці 6-граннік. Звычайна хаты не шаляваліся. Некаторыя дамы мелі каменны падмурак. Прысутнічае ганак, але не на кожным двары. Зімой для ўцяплення дамоў выкарыстоўвалася прызба. Канструкцыя прызбы, узнятай да ўзроўню вокнаў, добра бачна на заднім плане фотаздымку сям'і з в. Мацкавічы (Фота 16). Ліштвы вокнаў простыя, дэкор сустракаецца зрэдку. Здзіўляюць сваёй разнастайнасцю канструкцыі стрэх: прысутнічаюць як 2-схільныя, так і вальмавыя, і паўвальмавыя стрэхі. Пакрыццё страхі – чарот альбо салома, укладзены коласам дагары. Забудова паселішчаў вулічная, двары сустракаюцца 3 асноўных тыпаў: пагонныя, вяночныя і крытыя.

Апроч архітэктуры нямецкія фотаздымкі дазваляюць даволі добра апісаць традыцыйнае адзенне захаду Падзвіння. Даволі істотна тое, што на нямецкія фотаздымкі трапіла вялікая колькасць дзіцячага адзення. Апроч дзіцячага, пераважае таксама жаночае адзенне. Звязана гэта з тым, што расійскія ўлады імкнуліся эвакуяваць насельніцтва, і пад акупацыяй заставаліся збольшага тыя, хто ня мог ці не жадаў падацца ў бежанцы: старыя альбо маці з малымі дзецьмі. Большасць жа мужчын была прызвана ў войска.

На Пастаўшчыне мужчынскае адзенне на пачатак XX ст. яшчэ захоўвае свой традыцыйны выгляд, што добра бачна на фотаздымку з в. Норкавічы (Фота 9). Мужчына стаіць апрануты ў кажух, валёнкі і магерку. Кажух расшпілены і пад ім бачна доўгая кашуля, падпярэзаная вітым пасам. З гэтай жа вёскі ёсць і фотаздымак, які паказвае летняе мужчынскае адзенне (Фота 5). Яно складалася з белых партоў і нядоўгай белай кашулі, галаўны ўбор – картуз. Цікава, што на фотаздымку мужчына не падпярэзаны. На фотаздымку з в. Баяры (Фота 6) мужчына апрануты ў кажух, а малады хлопец у кашулю, клетчатыя штаны і пінжак.

Жаночае ж адзенне ў пачатку XX ст. змяняецца пад уплывам гарадской моды. Кашуля становіцца споднім адзеннем, а паверх яе апранаецца кофта альбо блуза. Разам са спадніцай такі гарнітур называўся "парачка". Звычайна "парачка" насілася без фартуха, але ён заставаўся элементам строю сталых жанчыны. Верхнім адзеннем да комплексу "парачкі" быў пінжак [6, с. 210].

У адрозненні ад кашуль, блузкі шыліся пераважна з фабрычнай, крамной тканіны. На захадзе Падзвіння блузкі шылі ў талію, на грудзях дзеля ўпрыгажэння ў некалькі шэрагаў застрочвалі складкі-"бryндачкі", нашывалі карункі і стужкі [2, с. 165]. Усё гэта добра адлюстравана на нямецкіх фотаздымках.

Так, на фотаздымку сялянак з в. Рудзі (Фота 10) добра бачна 2 асноўных варыянту дэкору кофтаў: альбо застрочанымі складачкамі, альбо атарочкай з тканіны іншага колеру. Таксама на гэтым здымку бачна разнастайнасць афармлення каўняроў у блузаў: на адной ён ляжачы, на другой увогуле адсутнічае. Гэты здымак з'яўляецца мастацкім партрэтам, што дазваляе разгледзець біжутэрыю. У адной дзяўчыны невялікія завушніцы з камянём круглай формы, у другой на шыі вісіць невялікі абразік з выявай Багародзіцы.

PolotskSU






**Фота 9. – Гаспадар дому з дачкой. В. Норкавічы, вясна 1916 г. Здымак з альбому жаўнера 52-га пяхотнага палка. Архіў У.Багданава**




**Фота 10. – Сялянкі вёскі Рудзі, 1917 г. Здымак з альбому жаўнера 131-га пяхотнага палка. Архіў У.Багданава**

Даволі добра бачны строй на фотаздымку сялянкі ля свайго дома ў вёсцы пад Паставамі (Фота 11). Дзяўчына апранута ў "парачку", але мае і фартух, галава не пакрыта. Блуза даўжынёй да пояса, мае каўнер-стоечку, рукавы даўжынёй на ¾, упрыгожана 2-ма нашытымі стужкамі. Спадніца аднатонная, мае знізу 2 паласы цямнейшага колеру. Фартух белы, упрыгожаны лёгкай зборачкай па перыметры. Па-сутнасці, на гэтым фотаздымку паказаны найбольш тыповы мясцовы строй.

PolotskSU






**Фота 11. – Сялянка ля свайго дома ў вёсцы пад Паставамі, 1915-1918 гг. Архіў У. Багданава**

Даволі цікавы фотаздымак танцаў у в. Норкавічы (Фота 12). На ім выяўлена цікавая сцэна вайсковага побыту – нямецкія жаўнеры танчаць з мясцовымі жыхаркамі. Сялянкі апрануты ў класічныя “парачкі”, пашытыя з крамной тканіны. Але гэты здымак можа з’яўляцца пацверджаннем думкі, выказанай Л. Вакар і Н. Бабровіч, што фартух у дадзеным камплекце адзення з’яўляўся паказчыкам статуса [6, с. 210]. На фотаздымку фартух прысутнічае ў строі толькі адной дзяўчыны, і толькі яна адна з пакрытай галавой, што таксама з’яўляецца паказчыкам сталай, прынамсі замужняй, жанчыны. Па сутнасці, менавіта фартух з’яўляецца для нас галоўнай адметнасцю дадзенага здымку: ён пашыты з белай тканіны, па перыметры ўпрыгожаны стужкай і лёгкай хвалістай зборачкай. Адметнае тое, што на фартуху прысутнічае кішэня, якая таксама па перыметры ўпрыгожана нашытай стужкай.




**Фота 12. – Танцы пад электрычнай лямпачкай з сялянкамі в. Норкавічы, 1916 г. Архіў У. Багданава**

Калі даваць характарыстыку жаночаму строю на Пастаўшчыне на падставе нямецкіх фотаздымкаў, то ён прадстаўляе сабой класічную “парачку”, якая складаецца з кофты-блузы і спадніцы. Кофта шылася з фабрычнай тканіны, даўжынёй да пояса, рукавы даўжынёй на ¾. Каўнер мог быць розных варыянтаў: адкладны, стаячы альбо ўвогуле адсутнічаць. Дэкараваліся кофты складкамі-“брындачкамі”, нашытымі стужкамі альбо атарочкай па краях тканінай іншага колеру. Спадніцы шыліся таксама з фабрычнай тканіны, пераважна аднатоннай, але таксама сустракаюцца афарбоўка ў

PolotskSU



касую клетку, палоску ці дробны прынт, кшталту гарошка ці кветачак. Дэкараваліся спадніцы альбо 2-ма нашытымі стужкамі на падоле, альбо 2-ма шэрагамі хвалістых складак. Галаўны ўбор – хустка.

Што тычыцца верхняй вопраткі, то жанчыны насілі разнастайныя світы, даўжынёй да калена, альбо пінжакі даўжынёй да пояса. Верхняе адзенне добра бачна на фотаздымку сялянак з в. Норкавічы (Фота 13). Звяртае на сабе ўвагу, што амаль кожная жанчына апроч верхняга адзення закутана яшчэ і ў вялікую хутску-абхінанку. Такія хутскі-абхінанкі ўласцівы для ўсяго Падзвіння, але найбольшы распаўсюд яны набылі на беларуска-літоўскім і беларуска-латышскім памежжы [6, с. 250].




**Фота 13. – Сялянкі в. Норкавічы чытаюць газеты, 1916 г. Здымак з альбому жаўнера 52-га пяхотнага палка. Архіў У.Багданава.**

Таксама на Пастаўшчыне шырока бытавалі вязаныя хусткі і шалікі з трусінай поўсці, якія маглі павязвацца пад барадой альбо на ўзор шаліка накідацца на галаву, закручвацца вакол шыі [6, с. 250]. Такую хустку можна пабачыць на партрэце сялянкі з в. Рудзі (Фота 14).




**Фота 14. – Партрэт Ядвінкі. В. Рудзі, 1917 г. Здымак з альбому жаўнера 131-га пяхотнага палка. Архіў У.Багданава**

PolotskSU



Асобную ўвагу варта надаць дзіцячаму адзенню, якое даволі добра праілюстравана на нямецкіх фотаздымках. Нямецкія жаўнеры вельмі любілі фатаграфаваць дзяцей і фатаграфавацца разам з дзецьмі.

Даволі змястоўны фотаздымак дзяцей з в. Вялікая Волься (Фота 15). На здымку на фоне клеці стаіць нямецкі жаўнер у атачэнні мясцовых дзяцей. Фотаздымак мае подпіс: “Panjekinder Welka Olsa 1916”. Па сутнасці, словы “Panjekinder” можна перакласці як мясцовыя дзеці альбо беларускія дзеці. Выкарыстанне слова “пан” як этнічнага вызначэння мясцовага насельніцтва даволі часта сустракаецца на нямецкіх фотаздымках. Нямецкія жаўнеры чулі ад мясцовага насельніцтва зварот “пан/пані” адзін да аднога, але не разумелі яго сэнс і памылкоўна інтэрпрэтавалі як этнонім.




**Фота 15. – Надпіс на фотаздымку: “Panjekinder Welka Olsa 1916” – Мясцовыя дзеці ў Вялікай Вольсе, 1916 г. Здымак з альбому лейтэнанта Рубенса, 17-ы пяхотны полк. Архіў У.Багданава.**

Дадзены фотаздымак дазваляе добра разглядзець дзіцячае адзенне. Малыя дзеці, дзесьці да ўзросту 3-4 год, насілі адну доўгую тунікападобную кашулю, дзеці старэйшага ўзросту мелі ўжо адзенне, падобнае да адзення дарослых. Хлопцы апраналіся ў нагавіцы і кашулі, дзяўчаты насілі “парачкі” альбо доўгія сукенкі з доўгім рукавом. Хлопцы без галаўных убораў, дзяўчаты ў хустках.

Адметнае дзіцячае адзенне зафіксавана на фотаздымку сям’і з в. Мацкавічы (Фота 16). На ім хлопцы 4-5 гадовага ўзросту апрануты ўжо амаль як дарослыя мужчыны: нагавіцы, кашулі, на адным камізэлька, а на іншым кофта-пінжак. І самае адметнае, галаўныя ўборы гарадскога ўзору - кепкі. Дзяўчынка 2-3 гадовага ўзросту апранута ў сукенку, паверх якой апранута блуза з доўгім рукавом, дэкараваныя складкамі, галаўны ўбор – чэпчык. На заходнім плане жанчына трымае на руках зусім малога дзіцёнка, апранутага ў доўгую кашулю, на галаве наматана хустка.




**Фота 16. – Сялянская сям’я у в. Мацкавічы, 1916 г. Здымак з альбому лейтэнанта Рубенса, 17-ы пяхотны полк. Архіў У.Багданава**

PolotskSU



Таксама як варыянт дзявочага дзіцячага адзення на Пастаўшчыне прысутнічаў сарафан, які апранаўся паверх доўгай кашулі. Такое адзенне можна пабачыць на фотаздымку сям'і з в. Норкавічы (Фота 5) і з в. Барадзіно (Фота 7).

Дзеці падлеткавага ўзросту насілі збольшага такое ж адзенне, як і дарослыя. На фотаздымку з в. Рудзі (фота 17) стаяць 2 дзяўчыны, адна апранута ў "парачку", другая – у доўгую сукенку, галаўныя ўборы – хусткі.




**Фота 17. – Дзеці ў в. Рудзі, 1915-1917 гг. Здымак з альбому жаўнера 131-га пяхотнага палка. Архіў У.Багданава**

Дзіцячае адзенне дэманструе большую разнастайнасць, чым дарослае. Апроч адзення, падобнага да звычайнага дарослага, дзеці, а перадусім дзяўчаты, мелі свае асаблівыя ўзоры адзення. Гэта, прынамсі, сарафаны і чапцы. Сюды ж можна аднесці і сукенкі, якія мала сустракаліся на той час у побыце дарослых жанчын. Калі дзявочае адзенне дэманструе пэўную адрознасць ад жаночага, то ў хлопцаў, наадварот, паўтарае мужчынскае. Больш за тое, часам яно імкнецца да гарадскога ўзору, у ім прысутнічаюць такія элементы, як камізэлька і кепка, што не было заўважана ў адзенні дарослых мужчын. Магчыма, гэта тлумачыцца тым, што гарадская жаночая мода раней пранікла на сяло, а мужчынская толькі пачынае распаўсюджвацца, што, перадусім, і праяўлялася ў адзенні моладзі і дзяцей. Таксама звяртае на сабе ўвагу той факт, што ў паўсядзённым дзіцячым адзенні сустракаюцца элементы, якія ў дарослым на той момант з'яўляліся святочнымі: сукенка ў дзяўчат і камізэлька ў хлопцаў.

Нямецкія фотаздымкі Першай сусветнай вайны з'яўляюцца даволі значнымі крыніцамі па вывучэнні этнаграфічнай спадчыны пэўных рэгіёнаў Беларусі, у тым ліку захаду Падзвіння. Яны маюць даволі вузкую дацiроўку, амаль заўсёды могуць быць прывязаны да канкрэтнага населенага пункта, у іншым жа выпадку да даволі вузкага арэалу мясцовасці.

Найбольш добра па фотаздымках можа быць даследавана матэрыяльная культура, асабліва народная архітэктура і адзенне. Даволі часта на фотаздымках зафіксаваны тыя рэчы, якія да нашага часу не захаваліся, і гэта, па-сутнасці, адзіная магчымасць іх даследаваць. І нягледзячы на тое, што значная часта здымкаў рабілася без мэты зафіксаваць канкрэтныя элементы народнага побыту, яны ўсё адно даволі інфарматыўныя.

З мінусаў гэтай катэгорыі крыніц варта адзначыць даволі вузкі арэал, які яны ахопліваюць. Да таго ж, варта ўлічваць абставіны, у якіх рабіліся здымкі. Адносна строяў, то мы маем фотаздымкі толькі той часткі насельніцтва, якая засталася пад акупацыяй, не сышла ў бежанцы.

PolotskSU



Але, нямецкія фотаздымкі Першай сусветнай вайны дазваляюць паказаць агульную карціну матэрыяльнай культуры захаду Падзвіння, прынамсі, народнай архітэктуры і адзення. Але для больш грунтоўнага вывучэння дадзеных праблем неабходна карыстацца і іншымі крыніцамі.

**Спіс выкарыстаных крыніц**


1. Беларусы : У 8 т. Т.2 Дойлідства / А.І.Лакотка; Ін-т мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору; Рэдкал. : В.К.Бандарчык, М.Ф. Піліпенка, А.І. Лакотка. – Мінск : Тэхналогія, 1997. – 391 с.
2. Бялявіна, В.М. Жаночы касцюм на Беларусі / В.М. Бялявіна, Л.В. Ракава. – Мінск : Беларусь, 2007. – 351 с.
3. Локотко, А.И. Белорусское народное зодчество: Середина XIX – XX в. /А. И.Локотко. – Мінск : Навука і тэхніка, 1991. – 287 с.
4. Сергачев, С.А. Белорусское народное зодчество / С.А.Сергачев. – Минск : Ураджай, 1992. – 225 с.
5. Сергачев, С.А. Народное зодчество Беларуси. История и современность / С.А.Сергачев. – Минск : Беларуская энцыклапедыя імя П. Броўкі, 2015. – 560 с.
6. Традыцыйнае адзенне Віцебшчыны / Укладальнікі Л.У. Вакар, Н.А. Бабровіч. – Мінск : Белстан, 2017. – 372 с.
7. Традыцыйная мастацкая культура беларусаў. У 6 т. Т. 2. Віцебскае Падзвінне / Т.Б. Варфаламеева, А.М. Боганева, М.А. Козенка і інш.; Складальнік Т.Б. Варфаламеева. – Мінск : Бел. Навука, 2004. – 910 с.


## GERMAN PHOTOGRAPHS OF THE FIRST WORLD WAR AS A SOURCE FOR STUDYING THE MATERIAL CULTURE OF THE WEST PADZVINNIE

A. DRUPOV, V. BOGDANOV

*In article authors consider German photographs of the First World War as a source for the study of ethnography of the West Padzvinnie. In article used photographs from the collection of V. Bogdanov, which were made on the territory of the Pastavy district of the Viciebsk region. The authors analyze German photographs as sources, and come to the conclusion that German photographs of the First World War are a good source for studying the material culture of the West Padzvinnie at the beginning of the 20-th century. Based on the photographs, one can examine folk architecture and folk clothes most thoroughly. In the article authors characterize folk architecture of the West Padzvinnie based on German photographs of the First World War. Was consider layout of settlements, development of yard, the architecture of house. Also based on the photographs, a characteristic is given to the folk dress of the West Padzvinnie, was consider men's, women's and children's clothing.*
***Key words:*** *First World War, ethnography, folk architecture, architecture, folk clothing, construction.*

УДК 303.446.4(=161.3)(475.5) “18/20”=161.3

## ДА ПЫТАННЯ ЎПЛЫВУ РЭЛІГІЙНАГА ФАКТАРА НА ФАРМІРАВАННЕ ЭТНІЧНАЙ ІДЭНТЫЧНАСЦІ БЕЛАРУСАЎ ЛІТВЫ

**Ізергіна А.М.**
Рэспубліка Беларусь, Мінск

*Рэлігійная ідэнтычнасць асобы з’яўляецца шматкампанентнай з’явай. Рэлігійны фактар у фарміраванні і захаванні этнічнай ідэнтычнасці беларусаў Літвы знаходзіцца пад уплывам іншых нацыянальнасцей. Згодна палявых матэрыялаў (сабраных аўтарам на працягу 2015-2018 гг. на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі), аўтар прыходзіць да высновы, што дзеянні і пазіцыя касцёла Св. Барталамея ў Вільні накіраваныя на захаванне і распрацоўку вобразаў гістарычнага мінулага беларусаў, спрыяюць кансалідацыі беларускай супольнасці Літвы і фарміраванню этнічнай ідэнтычнасці розных узроўняў.*
***Ключавыя словы:*** *беларусы Літвы, этнічная ідэнтычнасць, рэлігійная ідэнтычнасць, гістарычная памяць.*

Пытанні этнічнай ідэнтычнасці і этнічнай самасвядомасці з’яўляюцца аднымі з самых актуальных і, у той жа час, аднымі з самых складаных праблем, якія вывучаюцца сучаснай этналагічных навукай. Назіраецца паралельнае развіццё рознанакіраваных працэсаў: з аднаго боку, узмацненне тэндэнцый на адстойванне «сваёй» культурнай ідэнтычнасці, самабытнасці, якія павялічваюць разнастайнасць і багацце сусветнай супольнасці, і, з другога, - працэсы глабалізацыі і міграцыі, якія вядуць да ўніфікацыі і мультыкультурнасці сучаснага грамадства. Заканамернай з’яўляецца характарыстыка сучаснага свету наяўнасцю вялікай колькасці розных ідэнтычнасцяў, і кожны чалавек знаходзіцца перад выбарам сваёй мэты ў жыцці, месца ў грамадстве, а таксама сваёй духоўна-маральнай пазіцыі ў адносінах да іншых людзей і да ўсяго соцыуму. У гэтых адносінах асаблівае месца займае даследаванне ўплыву рэлігійнага фактара на фарміраванне этнічнай ідэнтычнасці. У межах дадзенай працы будзе зроблены аналіз уплыву рэлігійнага фактара на фарміраванне этнічнай ідэнтычнасці беларусаў Літвы на прыкладзе дзейнасці праваслаўнай і каталіцкай цэркваў у перыяд незалежнасці.

Беларусы Літвы – насельніцтва Літоўскай Рэспублікі, якое мае беларускія карані, і насельніцтва, якое адносіць сябе да беларускага этнасу. Згодна дадзеных перапісу 2011 г. на тэрыторыі Літоўскай рэспубліцы пражывала 36 227 беларусаў [7]. Канфесійны склад беларусаў Літвы згодна дадзеных перапісу 2011 г. на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі каталіцкае насельніцтва складае 47 % ад усёй колькасці беларускай этнічнай групы, праваслаўнае - 32 %, прадстаўнікі іншых канфесій – 24 % [7].

Тэрыторыя даследавання – межы сучаснай літоўскай дзяржавы. Крыніцай даследавання сталі этнаграфічныя матэрыялы, якія былі сабраны аўтарам падчас сустрэч з беларусамі Літвы на працягу 2015 – 2018 гг. на тэрыторыі Літоўскай Рэспублікі. Рэспандэнты прадстаўляюць тры пакаленні жыхароў сучаснай літоўскай дзяржавы: аўтахтоннае насельніцтва (якое нарадзілася на тэрыторыі сучаснай Літвы); насельніцтва, якое пераехала ў пасляваенны перыяд; - другое/трэцяе пакаленне беларусаў, якія нарадзіліся ў Літоўскай рэспубліцы.

Рэлігія з’яўляецца адным з найважнейшых кампанентаў культуры. Яна шмат у чым вызначае асноўныя контуры этнічнай культуры і адыгрывае вялікую ролю ў гісторыі беларускай этнічнай супольнасці ў Літве. Рэлігійная ідэнтычнасць асобы з’яўляецца шматкампанентнай з’явай. У пытанні фарміравання і захаванні рэлігійнай ідэнтычнасці беларусаў Літвы

PolotskSU

МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

УСТАНОВА АДУКАЦЫІ
«ПОЛАЦКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ»

# БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
# ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
# І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Пад агульнай рэдакцыяй
канд. гіст. навук, дац. А.І. Корсак;
канд. гіст. навук В.У. Чараўко;
канд. гіст. навук, дац. У.Я. Аўсейчыка

Наваполацк
Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт
2021

PolotskSU

УДК 343.13(063)
ББК 67.410.2я431

Рэкамендаваны да выдання саветам гуманітарнага факультэта
Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта (пратакол № 3 ад 29.03.2021)

*Рэдакцыйная калегія:*

*А.І. Корсак,* канд. гіст. навук, дац. (адк. рэд.), заг. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*В.У. Чараўко,* канд. гіст. навук, дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта;
*У.Я. Аўсейчык,* канд. гіст. навук, дац., дац. каф. гісторыі і турызму Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта.

*Рэцэнзенты:*

*С.В. Кулінок,* канд. гіст. навук, заг. аддзела публікацый Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь;
*Т.А. Джумантаева,* канд. культуралогіі, дац., дырэктар Нацыянальнага Полацкага гісторыка-культурнага музея-запаведніка.

**Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў :** зб. арт. V міжнар. навук. канф., Полацк, 15–16 крас. 2021 г. / Полац. дзярж. ун-т ; пад агульн. рэд. А.І. Корсак (адк. рэд.), В.У. Чараўко, У.Я. Аўсейчыка. – Наваполацк : Полац. дзярж. ун-т, 2021. – 272 с.
ISBN 978-985-531-737-2.

У зборніку змешчаны навуковыя артыкулы па выніках работы V міжнароднай навуковай канферэнцыі “Беларускае Падзвінне: вопыт, методыка і вынікі палявых і міждысцыплінарных даследаванняў”. Прадстаўлены вынікі антрапалагічных і археалагічных даследаванняў Беларускага Падзвіння і сумежных тэрыторый. Прыведзены новыя даныя аб гістарычных лёсах, матэрыяльнай і духоўнай спадчыне рэгіёна Паўночнай Беларусі ў шырокім храналагічным кантэксце (ад першабытных часоў да сучаснасці).

Разлічаны на прафесійных гісторыкаў, археолагаў, этнолагаў, антраполагаў, мастацтвазнаўцаў, студэнтаў гістарычных спецыяльнасцей ВНУ, краязнаўцаў і ўсіх, хто цікавіцца гісторыяй Беларусі.

**УДК 343.13(063)**
**ББК 67.410.2я431**

**ISBN 978-985-531-737-2**

© Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт, 2021

PolotskSU

*Навуковае выданне*

**БЕЛАРУСКАЕ ПАДЗВІННЕ:
ВОПЫТ, МЕТОДЫКА і ВЫНІКІ ПАЛЯВЫХ
І МІЖДЫСЦЫПЛІНАРНЫХ ДАСЛЕДАВАННЯЎ**

Зборнік артыкулаў
V міжнароднай навуковай канферэнцыі
(Полацк, 15–16 красавіка 2021 г.)

Адказны рэдактар *А. І. Корсак*

Тэхнічнае рэдагаванне і камп'ютарная вёрстка
*І. М. Чапкевіч*
Дызайн вокладкі *М. С. Мухаморавай*

Падпісана да друку 20.05.2021. Фармат 60×84 $^{1}/_{8}$. Бумага афсетная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 31,63. Улік.-выд. арк. 32,96. Тыраж 70 экз. Заказ 810.

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
установа адукацыі «Полацкі дзяржаўны ўніверсітэт».

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі
выдаўца, вырабніка, распаўсюджвальніка друкаваных выданняў
№ 1/305 ад 22.04.2014.

ЛП № 02330/278 ад 08.05.2014.

Вул. Блахіна, 29, 211440, г. Наваполацк.